Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2024-11-15

# «Віцебскі край» збірае радзімазнаўцаў

**21—22 лістапада ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна пройдзе чарговая, дзясятая па ліку, навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Акрамя бібліятэкі, яе арганізатарамі выступаюць Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Віцебскі абласны краязнаўчы музей.**

Прадстаўнічы навукова-практычны форум збярэ болей чым 100 навукоўцаў, краязнаўцаў, бібліятэкараў, музеязнаўцаў. Канферэнцыі будзе папярэднічаць круглы стол «Вайна – трагедыя і памяць народа: 80 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», які пройдзе на базе Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Мяркуецца разгляд даволі цікавых, арыгінальных тэм, што праліваюць святло на розныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны: «Рэпартаж ваеннага кінадакументаліста Георгія Голубава “Людзі з канцлагера” з франтавога спецвыпуску № 1 за 1944 год “Бітва за Віцебск”» (гэтую тэму раскрые Ігар Рымашэўскі з НАН Беларусі), «Дзеянні савецкай авіяцыі далёкага дзеяння па зрыве перагрупоўкі нямецкіх войск на Полацкім напрамку ў чэрвені–ліпені 1944 г.» (краязнаўца Сяргей Капыл), «Вызваленне Мёраў 4 ліпеня 1944 года ў дакументах і ўспамінах відавочцаў» (краязнаўца Вітольд Ермалёнак), «Ураджэнцы Віцебскай вобласці ў баях Вялікай Айчыннай вайны: яны прадстаўляліся да звання Героя Савецкага Саюза» (настаўнік Канстанцін Гайдукоў)…

Удзельнікі канферэнцыі выступяць на наступных секцыях: «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край ад старажытнасці да 1917 г.», «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край з 1918 да 1941 гг.», «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край з 1941 г. да сучаснасці», «Літаратуразнаўства», «Краязнаўства ў сістэме гуманітарных навук».

Па выніках чарговай канферэнцыі «Віцебскі край» мяркуецца папоўніць бібліятэку віцебсказнаўчай літаратуры: пабачыць свет выданне зборніка дакладаў і выступленняў. Канферэнцыя з году ў год набывае болей грунтоўнае гучанне як сапраўдная падзея ў гісторыка-краязнаўчым жыцці не толькі Віцебшчыны, але і ўсёй Беларусі.

**Кастусь ЛЕШНІЦА**